

НА ВІЦЕБШЧЫНЕ ПЕРШЫ ТЫСЯЧНІК

3

РЭЧЫ ЧАЛАВЕКА — НАПАМІН, ШТО ЁН ЖЫЎ

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

5 ЖНІЎНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 152 (29774)

### ЛІЧБА ДНЯ

**Больш за 6 млн 512 тысяч чалавек**

*атрымала ў Беларусі адну дозу вакцыны супраць COVID-19, з іх больш як 6 млн 424 тысячы прайшло поўны курс вакцынацыі, паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя. У Брэсцкай вобласці поўны курс вакцынацыі прайшло больш за 892,3 тысячы чалавек, Віцебскай — больш за 789,9 тысячы, Гомельскай — больш за 973,8 тысячы, Гродзенскай — больш за 693,5 тысячы, Магілёўскай — больш за 691 тысячу, Мінскай — больш за 983,7 тысячы і Мінску — больш за 1,28 млн. Завяршыла курс вакцынацыі больш за 111 тысяч супрацоўнікаў арганізацый і ведамстваў. У краіне таксама праводзіцца вакцынацыя непаўналетніх. Адну дозу вакцыны атрымала больш за 150,7 тысячы падлеткаў 12-17 гадоў, з іх больш за 145,5 тысячы прайшло поўны курс вакцынацыі. Адну дозу вакцыны атрымалі 70,4 працэнта ад агульнай колькасці насельніцтва краіны, поўны курс вакцынацыі прайшлі 69,4 працэнта насельніцтва. Бустарную вакцынацыю прайшлі 26,1 працэнта насельніцтва.*

### КОРАТКА

- **Аляксандр Лукашэнка працягне паездкі па рэгіёнах: наведае Віцебскую вобласць і разгледзіць работу інтэграцыйных аб'яднанняў у АПК.**
- Форум патрыятычных сіл пройдзе 9 жніўня ў Мінску. Яго асноўная задача — зверыць гадзіннікі па пытанні далейшага развіцця грамадзянскай супольнасці.
- **Удзел ва Усходнім эканамічным форуме пацвердзілі 40 краін.**
- Больш як Br1,7 млрд інвестыцый прыцягнута ў эканоміку Брэсцкай вобласці ў І паўгоддзі.

ISSN 1990 — 763X

# Случанкі на жніве

У адной з найлепшых на Случчыне гаспадарак «Аграфірма «Лучнікі» на сёлетнім жніве на розных участках працуюць больш за дваццаць жанчын. Сярод іх — Раіса БОЙКА і Марына БЕЗБАРОДЗЬКА *(яны на гэтых здымках)*. Раіса Іосіфаўна — тэхнолаг, працуе ў калектыве гаспадаркі ўжо трыццаць тры гады, апошнія дваццаць узначальвае цэх перапрацоўкі збожжа. У час жніва адказвае за працу зернесушылкі, правярае якасць і вільготнасць ураджаю, прывезенага з палеткаў, даводзіць яго да патрэбнай кандыцыі. А ўраджай у гаспадарцы сёлета будзе багаты, напрыклад, азімы ячмень дасягнуў ураджайнасці 83,1 цэнтнера з гектара.

А Марына Безбародзька па адукацыі аграном, апошнія гады з'яўляецца брыгадзірам першага ўчастка, гэтымі днямі яна з раніцы да вечара на полі, а хлебнае поле на яе ўчастку — паўтары тысячы гектараў. Марына Паўлаўна кантралюе працу камбайнаў, сочыць за якасцю ўборкі, скошвае палеглыя ўчасткі. Вядома, ганарыцца, што ўраджайнасць рапсу, змалочанага на яе ўчастку, рэкордная — 87—89 цэнтнераў з гектара.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**





Шануй сваё

## ІНТЭРАКТЫЎНЫЯ ЗАНЯТКІ, ВУЧЭБНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ І ЭКСКУРСІІ

### Якія праекты прапаноўвае Інстытут гісторыі да Года гістарычнай памяці

**Веданне сваёй гісторыі — магутная зброя ў абароне незалежнасці краіны. Нездарма 2022 год аб'яўлены Годам гістарычнай памяці. З гэтай нагоды падрыхтавана шмат праектаў: ад канцэртаў і выстаў да навуковых канферэнцый і круглых сталоў. Якія мерапрыемствы адбудуцца ў розных куточках нашай краіны, расказалі супрацоўнікі Інстытута гісторыі НАН Беларусі.**

У рэгіёне запланаваны шэраг навуковых канферэнцый, прысвечаных гісторыка-культурнай спадчыне. Першая з іх адбудзецца 12 жніўня ў Слоніме, наступная пройдзе ў верасні ў Смалявічах, у кастрычніку навукоўцы наведаюць Астравец, а ў лістападзе — Віцебск. Спікерамі было адзначана, што акрамя вопытных вучоных удзел у канферэнцыях прымуць школьнікі, студэнты і краязнаўцы.

СТАР. 3

Закон і парадак

## У НАШАЙ КРАІНЕ СІСТЭМНАЙ КАРУПЦЫІ НЯМА. І НЕ БУДЗЕ

**Якое месца па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй займае сёння Беларусь сярод краін Еўропы? Як праходзяць падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі службовых асоб праваахоўных органаў? Якія механізмы дзяржаўнай антыкарупцыйнай дзейнасці з'яўляюцца найбольш паспяховымі? На гэтыя і іншыя актуальныя пытанні адказалі прадстаўнікі Следчага камітэта, МУС і Генеральнай пракуратуры нашай краіны.**

### Адмоўны эфект эканамічных злачынстваў вымяраецца не толькі рублямі

Шкода ад карупцыйных злачынстваў сёлета за першае паўгоддзе склала больш за 9 мільёнаў рублёў, паведаміў **начальнік упраўлення па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю Генеральнай пракуратуры Ігар ГРЭЙБА.** На маёмасць сумай больш за 11 мільёнаў рублёў тых асоб, якія ўчынілі дадзеныя злачынствы, накладзены арышт, што, як мяркуецца, дазволіць забяспечыць пакрыццё нанесенай шкоды.

Але варта мець на ўвазе, што шкода, якая наносіцца карупцыйнымі злачынствамі, выяўляецца не толькі матэрыяльна. Можна казаць і аб іншым істотным памеры шкоды, якая наносіцца дзяржаўным органам і прадпрыемствам. У прыватнасці, падае аўтарытэт дзяржоргана, арганізацыі, магчымая ўпушчаная выгада.

СТАР. 4

Ураджай-2022

# САСТАЎНЫЯ ЧАСТКІ ПОСПЕХУ ЖНІВА —

## тэхнічны складнік і гатоўнасць людзей

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА з рабочай паездкай наведаў Бабруйскі раён, паведамляе БелТА.**

Ігар Сергеенка наведаў шэраг гаспадарак Бабруйскага раёна, азнаёміўся з работай аб'ектаў АПК. У час візіту ён паразмаўляў з механізатарамі ААТ «Міхалёўская Ніва» і не ўтрымаўся ад магчымасці праехаць разам з маладзёжным экіпажам у кабіне камбайна, каб убачыць працэс знутры. Хоць сядзець за штурвалам «Палесся» Ігару Сергеенку ў жыцці ўжо даводзілася, але ўсё роўна эмоцыі перапаўнялі. «Было здорава і цікава, — падзяліўся ён. — На камбайне працаваў вельмі даўно, яшчэ падчас вучобы. Цэлы сезон правёў у якасці памочніка».



Фота БелТА.

«У Бабруйскім раёне ўжо ўбрана амаль трэць збожжавых ад усіх пасяўных плошчаў, ураджайнасць склала крыху больш за 30 ц/га — вышэй, чым у мінулым годзе, — сказаў Ігар Сергеенка. — Размаўляючы з механізатарамі, спецыялістамі і кіраўнікамі гаспадарак, разумееш, што да ўборкі ўраджаю падрыхтаваны і людзі, і тэхніка. Таксама гатовы зернесушыльныя комплексы, створаны адпаведныя ўмовы, арганізавана двухразовае харчаванне — абед і вячэра».

Паводле слоў кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, у аграрыяў ёсць усё, каб выканаць даручэнні Прэзідэнта, якія ён даў падчас вялікай рэспубліканскай селектарнай нарады па пытаннях уборачнай кампаніі. Дадатковым стымулам для людзей стануць добрыя ўмовы працоўных спаборніцтваў і годны ўзровень аплаты працы: у час гарачай пары можна зарабляць ад Br150 да Br200 у дзень, плюс прэміяльныя.

«Задачы, пастаўленыя кіраўніком дзяржавы на праведзенай селектарнай нарадзе з кіраўнікамі ўсіх сельгаспрадпрыемстваў краіны, павінны быць рэалізаваны, у тым ліку за кошт арганізаванасці і рэалізацыі ўсіх запланаваных мерапрыемстваў, — падкрэсліў Ігар Сергеенка. — Састаўныя часткі поспеху — як тэхнічны складнік, так і гатоўнасць людзей. Павінны быць разуменне і належная арганізацыя з боку кіраўнікоў раённаў і гаспадарак. На сёння ўсё гэта ёсць».

Маніторынг, які праводзіць КДК, таксама пацвердзіў, што выяўленыя перад пачаткам масавай уборачнай кампаніі недахопы выпраўлены ў кароткія тэрміны. Той жа рамонт тэхнікі, якая перыядычна выходзіць са строю, ажыццяўляецца пераважна ў полі, каб не губляць час. Майстэрні гаспадарак таксама гатовы ў любы момант выправіць паломку: запчасткі ёсць, у прыцягненні дадатковых спецыялістаў або пабочных прадпрыемстваў неабходнасці няма. Акрамя таго, у кожным раёне ёсць спецыялізаваныя рамонтныя брыгады, аб гэтым паклапаціліся загадзя.

«Надвор'е цудоўнае, тэхніка працуе — усе падрыхтаваныя да ўстаноўленага тэрміну камбайны выйшлі ў поле, — рэзюмаваў кіраўнік Адміністрацыі. — Настрой у людзей таксама добры. Тым не менш разумееш, што за ўсім гэтым стаіць нялёгкая праца».

Наша пазіцыя

# УСВЕДАМЛЕННЕ КАЛЕКТЫЎНАЙ АДКАЗНАСЦІ

## Беларусь вылучыла шэраг ініцыятыў для руху да міру без ядзернай зброі

**Сусветнай супольнасці неабходна сумесна прыняць рашучыя захады па ўсебаковым умацаванні Дагавора аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі (ДНЯЗ) і стварэнні ўмоў для паступальнага руху да міру без ядзернай зброі. Беларускі бок у сувязі з гэтым прапанаваў шэраг паступальных крокаў, якія агучыў начальнік аддзела міжнароднай бяспекі і кантролю над узбраеннямі галоўнага ўпраўлення шматбаковай дыпламатыі Міністэрства замежных спраў Беларусі Васіль ПАЎЛАЎ на канферэнцыі па разглядзе дзеяння Дагавора аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі (ДНЯЗ) у Нью-Ёрку, паведамляе БелТА.**

«Цяпер усім нам неабходна ўсведамленне калектыўнай адказнасці, каб сумесна прыняць рашучыя захады па ўсебаковым умацаванні ДНЯЗ і стварэнні ўмоў для паступальнага руху да міру без ядзернай зброі. Беларускі бок гатовы падтрымліваць усе канструктыўныя намаганні і ініцыятывы ў гэтым напрамку», — сказаў дыпламат.

У якасці першага кроку Беларусь прапанавала прыняць канкрэтныя меры па зніжэнні ядзерных рызык і наданні працэсу ядзернага раззбраення шматбаковага і неабарачальнага характару. Асаблівая роля і адказнасць у гэтым пытанні павінна належаць дзяржавам, якія валодаюць ядзернай зброяй, лічыць беларускі бок.

Па-другое, як абазначыў дыпламат, трэба забяспечыць больш хуткае ўступленне ў сілу Дагавора аб усёабдымнай забароне ядзерных выпрабаванняў (ДУЗЯВ), што адыгрывае крытычна важную ролю для дасягнення мэт ядзернага раззбраення. «Дагавор, які ратыфікавалі 174 дзяржавы, мае практычна ўніверсальны характар. Заклікаем дзяржавы, ад чыіх дзеяннях залежыць лёс ДУЗЯВ, праявіць палітычную волю і прыняць неадкладныя меры для яго ўступлення ў сілу», — падкрэсліў Васіль Паўлаў.

Надаць новы імпульс працэсу стварэння зон, свабодных ад ядзернай зброі, — такая трэцяя прапанова беларускага боку, агучаная на канферэнцыі. «У сярэдзіне 90-х гадоў мінулага стагоддзя Беларусь прапанавала ідэю стварэння такой зоны ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. На жаль, тады добры парыў і заклік Беларусі пачутымі не былі», — канстатаваў прадстаўнік МЗС.

У якасці наступнай, чацвёртай, ініцыятывы ён прапанаваў разгледзець пытанне аб распрацоўцы глабальнага юрыдычна абавязвальнага пагаднення аб атрыманні нядзернымі дзяржавамі з боку краін, якія валодаюць ядзернай зброяй, недвухсэнсоўных і безумоўных гарантый аб непрымяненні ядзернай зброі і недапушчэнні пагрозы яе прымянення. «Гэта ў поўнай меры ўпісваецца ў логіку прапановы кіраўніка беларускай дзяржавы, зробленай у маі бягучага года ў пісьме генеральнаму сакратару ААН, аб неабходнасці выпрацоўкі зразумелых і празрыстых дамоўленасцяў аб правілах новага сусветнага парадку, што забяспечыць гарантыі бяспекі ўсім членам міжнароднай супольнасці», — сказаў Васіль Паўлаў.

«Ад эфектыўных і доўгатэрміновых рашэнняў у сферы ядзернага раззбраення і нераспаўсюджвання залежаць непасрэдна мір, бяспека, стабільнасць і, у рэшце рэшт, само існаванне чалавецтва. Беларусь гатова да канструктыўнага ўзаемадзеяння з усімі дзяржавамі-ўдзельніцамі ў мэтах поспеху канферэнцыі», — рэзюмаваў дыпламат.

# ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ ВЁСКІ ДУНАІ

## Дэпутат Палаты прадстаўнікоў знайшла ў архіве ўнікальны дакумент, які стаў асновай мемарыяла

**Сёння ў вёсцы Дунаі, што на Лагойшчыне, адбудзецца ўрачыстае адкрыццё мемарыяла памяці жыхароў вёскі, спаленых фашыстамі ў маі 1943 года.**

Мемарыял створаны па ініцыятыве намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, аўтара Закона Рэспублікі Беларусь «Аб генацыдзе беларускага народа» Ліліі Ананіч. Дэпутат адшукала спонсарскія сродкі на стварэнне мемарыяла і добраўпарадкаванне прылеглай тэрыторыі. Работы былі праведзены пад патранатам Лагойскага раённага выканаўчага камітэта.

Для Ліліі Ананіч гэта яшчэ і асабістая, сямейная гісторыя. «Дунаі — родная вёска майго бацькі, — расказала «Звяздзе» Лілія Станіславаўна. —- У той страшны дзень 5 мая 1943 года разам з аднавяскоўцамі (38 чалавек спалены жыўцом, у тым ліку 8 старых і 9 дзяцей) пакутніцкую смерць прынялі і мае родныя — бабуля Домна Яцэвіч і прабабуля Вера Зінкевіч. Злачынства нелюдзяў было дакументальна зафіксавана адпаведным актам праз пяць дзён — 22 мая камісіяй з ліку партызан, якія прыбылі на папялішча, і ацалелых мясцовых жыхароў. Ужо тады, нават у акупацыі, беларусы фіксавалі злачынствы супраць свайго народа...»

Гэты ўнікальны гістарычны дакумент дэпутат адшукала тры гады назад у Нацыянальным архіве Беларусі. Сярод прозвішчаў тых, хто яго падпісваў у маі 43-га, яна знайшла і подпіс свайго бацькі, партызана Станіслава Іосіфавіча Яцэвіча. Чалавек падпісваў сведчанне забойства сваіх маці і бабулі. Яшчэ адзін страшны штрых да таго, што мы нарэшце праўдзіва сталі называць генацыдам беларусаў...

Гэты дакумент — Акт спаленай вёскі Дунаі ад 22 мая 1943 года — будзе ўвекавечаны і ў новым мемарыяле на месцы спачыну ахвяр фашыстаў — на камені-валуне, узведзеным на мармуровым пастаменце, захаваная копія з пайменным спісам усіх 38 жыўцом спаленых людзей і шасці чалавек, сагнаных на прымусовыя працы ў Германію

Хоць Дунаі і значыцца ў спісе адроджаных вёсак, цяпер гэта толькі невялікі дачны пасёлак. «Знака памяці аб усіх спаленых жыхарах вёскі тут не было, — расказвае Лілія Ананіч. — У шасцідзясятыя гады на месцы роднага папялішча надмагільны помнік устанавіў мой бацька і побач яшчэ адна сям'я. Даглядалі магілы сваякі...»

Цяпер мемарыял згадае ўсіх, хто загінуў у Дунаях, пайменна. А колькі такіх жалобных спісаў яшчэ застаюцца на нашай зямлі невядомымі...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

Блізкая ўлада

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 6 жніўня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;

• кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Надзея Анатолеўна ЛАЗАРЭВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.


**Антикризисный управляющий иностранного общества с ограниченной ответственностью «Арвибелагро» – ООО «Капитал Диалог» (организатор торгов) ИЗВЕЩАЕТ**

о проведении 22.08.2022 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая 5, пом. 221 пятых повторных открытых торгов по продаже дебиторской задолженности иностранного общества с ограниченной ответственностью «Арвибелагро»: ООО «Экофермер» (размер задолженности – 452 552,04 BYN) – начальная цена 270 531,22 BYN; ООО «БЕЛСКОР» (размер задолженности – 65,82 BYN) – начальная цена 39,49 BYN.

*Условия приема заявлений и прилагаемых к ним документов:* прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 19.08.2022.

*Сумма шага аукциона:* шаг аукциона (5 % от цены лота): 13 526,56 BYN – по лоту № 1; 1,97 BYN – по лоту № 2.

*Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним:* предмет торгов – дебиторская задолженность ИООО «Арвибелагро» – задолженность: ООО «Экофермер» (размер задолженности – 452 552,04 BYN); ООО «БЕЛСКОР» (размер задолженности – 65,82 BYN). Ознакомиться с документами можно по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5/221, предварительно согласовав с представителем управляющего по тел. 8 029 130 85 30.

*Сведения о продавце, его контактные телефоны:* ИООО «Арвибелагро», тел. 8 029 130 85 30.

Сведения об организаторе торгов, его место нахождения и контактные телефоны: антикризисный управляющий ИООО «Арвибелагро» – ООО «Капитал Диалог», г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5, каб. 221, 2-й этаж, тел. 8 029 130 85 30.

*Место нахождения предмета торгов:* г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5, каб. 221.

*Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка, необходимые реквизиты текущего (расчетного) банковского счета продавца, на который должна быть перечислена сумма задатка:* задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота: 13 526,56 BYN – по лоту № 1; 1,97 BYN – по лоту № 2. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 11.07.2022 г. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации по 19.08.2022 г. на р/с ИООО «Арвибелагро» р/с BY06 BPSB 3012 1559 8601 1933 0000 (BYN) в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 590700407;

о проведении 05.09.2022 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая 5, пом. 221 первых открытых торгов по продаже дебиторской задолженности иностранного общества с ограниченной ответственностью «Арвибелагро»: ООО «Инджастед» (размер задолженности – 3 044,17 BYN) – начальная цена 3 044,17 BYN.

*Условия приема заявлений и прилагаемых к ним документов:* прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 02.09.2022.

*Сумма шага аукциона:* шаг аукциона (5 % от цены лота): 152,21 BYN.

*Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним:* предмет торгов – дебиторская задолженность ИООО «Арвибелагро» – задолженность: ООО «Инджастед» (размер задолженности – 3 044,17 BYN). Ознакомиться с документами можно по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5/221, предварительно согласовав с представителем управляющего по тел. 8 029 130 85 30.

*Сведения о продавце, его контактные телефоны: ИООО «Арвибелагро», тел. 8 029 130 85 30.*

*Сведения об организаторе торгов, его место нахождения и контактные телефоны: антикризисный управляющий ИООО «Арвибелагро» – ООО «Капитал Диалог», г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5, каб. 221, 2-й этаж, тел. 8 029 130 85 30.*

*Место нахождения предмета торгов:*
*г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5, каб. 221.*

*Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка, необходимые реквизиты текущего (расчетного) банковского счета продавца, на который должна быть перечислена сумма задатка:* задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота: 152,21 BYN. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 03.09.2022 г. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации по 19.08.2022 г. на р/с ИООО «Арвибелагро» р/с BY06 BPSB 3012 1559 8601 1933 0000 (BYN) в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 590700407.

Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее чем за один день до их проведения. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. Участие в торгах оформляется итоговым протоколом в день их проведения. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней со дня проведения торгов. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Героі жніва

# БЫЦЬ ПЕРШЫМ — ПАЧЭСНА І АДКАЗНА

**Учора на Віцебшчыне віталі першага вадзіцеля-«тысячніка» сярод моладзі па выніках аператыўнага раённага спаборніцтва на ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур. Ім стаў Дзмітрый ІВАНОЎ з агракомплексу «Янавічы» ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка» Віцебскага раёна.**



Імя Дзмітрыя Іванова вядомае не толькі ў раёне, але і ў вобласці — вадзіцель у мінулым годзе станавіўся пераможцам у сваёй групе сярод маладых экіпажаў і прымаў віншаванні на абласным фестывалі-кірмашы працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2021» у Шуміліне, узначальваў калону перадавікоў на раённым аграрным форуме. У гэтыя гарачыя дні жніва сям'я Дзмітрыя амаль не бачыць яго дома, некалькі хвілін на разгрузку — і зноў да залатой нівы. За дзень паспявае зрабіць да дваццаці рэйсаў, але, прызнаецца, працуе не на хуткасць, а на якасць, каб не згубіць ні аднаго зярнятка. «Бацькі вучылі працаваць сумленна, каб не мець сораму перад сабой і людзьмі. І проста ў адказе мы, хлебаробы, за лёс ураджаю, нашай агульнай справы», — раскрывае формулу поспеху аграрый. Свайго «жалезнага каня» — МАЗа — да пачатку ўборачнай падрыхтаваў сам, перабраўшы кожны вінцік, так што прастойваць на рамонце, губляючы сонечныя хвіліны, не даводзіцца.

Гэта сёмае жніво ў прафесійным летапісе Іванова, за шэсць гадоў ён пяць разоў станавіўся лідарам у сваёй катэгорыі. Поспехі на хлебнай ніве суправаджаюцца ўвагай шматлікіх журналістаў, да якой сціплы вясковец так і не змог прывыкнуць. Затое ўсе дыпломы і газетныя артыкулы, якіх за сезон збіраецца багата, беражліва захоўвае любая жонка Алена. Яна і дзве дачушкі Маша і Аліса з'яўляюцца для Дзмітрыя жыватворнай крыніцай, адкуль ён чэрпае сілы і падтрымку. Маша скончыла першы клас Янавіцкай школы, у якой калісьці вучыліся яе бацькі, і ўжо ведае, наколькі цяжкая і адказная прафесія ў таты. «Самы лепшы!» — так наперабой характарызуюць бацьку дзяўчаткі.

Пра сілу хлеба, якая аб'ядноўвае народ, малады вадзіцель ведае не па чутках. Менавіта яму даверылі перадаваць мяшочак з зернем ураджаю-2021 удзельнікам рэспубліканскага аўтапрабегу «Сімвал адзінства», які прайшоў восенню ў Віцебску. Сёлета з першай у гэтым сезоне перамогай Іванова прыехала павіншаваць дэлегацыя Віцебскага раёна на полі каля вёскі Глазомічы.

«Віцебскі раён славіцца працалюбівымі, моцнымі і адказнымі кадрамі. Радуе, што менавіта моладзь задае тэмп жніву, з'яўляецца прыкладам для другіх гаспадарак. Тысячу тон зерня, якая складае чвэрць ад усяго ўраджаю ў агракомплексе, перавёз менавіта Дзмітрый Уладзіміравіч. Гэта нялёгкая і карпатлівая праца ад усходу да захаду — прыклад любові да сваёй зямлі і патрыятызму. Жадаю вам новых перамог, моцнага здароўя і бесперапыннай работы тэхнікі», — павіншаваў перадавіка **старшыня Віцебскага райвыканкама Генадзь САБЫНІЧ.**

Свае шчырыя словы падзякі за вялікі ўклад у агульны каравай вадзіцелю выказалі прадстаўнікі аблвыканкама, раённай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў АПК, абласнога і раённага БРСМ, уручыўшы дыпломы і каштоўныя падарункі.

Са звонкай песняй правадзілі Дзмітрыя ў машыну, якому ўжо не цярпелася сесці за руль, бо побач чакаў выгрузку жоўты «Нью Холанд» пад кіраўніцтвам камбайнера Яўгена Кухарава, які таксама перайшоў сваю тысячную мяжу. У маладзёжнага дуэта — вадзіцеля і камбайнера — на залатой ніве гараць вочы і справа ідзе хутка. «Дабіцца поспеху можна і на малой радзіме, галоўнае — працаваць сумленна, аддаючы свае сілы абранай прафесіі», — заключыў Дзмітрый Іваноў.

Агракомплексу «Янавічы» ў гэтым сезоне трэба ўбраць 2,9 тысячы гектараў збожжавых і зернебабовых культур, на 4 жніўня ў гаспадарцы аграрыі выканалі план на 25 працэнтаў. Ураджайнасць складае 50,4 цэнтнера з гектара, ва ўборачнай задзейнічана сем камбайнаў.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

Надвор'е

# НАПЕРАДЗЕ ДВА ДНІ СПЯКОТЫ,

## а там пачынаецца сезон туманаў

**Нягледзячы на тое што другі месяц лета стартаваў гарачым надвор'ем, ён не змог папоўніць шэрагі цёплых месяцаў. Сярэдняя тэмпература паветра ў гэтым месяцы аказалася на 1 градус ніжэйшай за кліматычную норму. Пры гэтым па дажджах норма ліпенем была выкананая, а месцамі па захадзе краіны нават перавышаная ў 2—2,5 раза, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



А 5 жніўня наогул нам абяцаюць жоўты ўзровень небяспекі з-за спякоты. Чакаецца пераважна без ападкаў. Толькі днём па паўднёвым усходзе краіны, дзе адаб'ецца ўплыў няўстойлівай паветранай масы, месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Удзень паветра прагрэецца да плюс 27—33 градусаў.

У суботу ўмовы надвор'я пачнуць мяняцца. У начныя гадзіны яшчэ захаваецца ўплыў поля павышанага атмасфернага ціску, таму істотных ападкаў не прагназуецца. А вось раніцай і ўдзень на нашу тэрыторыю чакаецца перамяшчэнне франтальнага падзелу з Заходняй Еўропы, які праявіць сябе на большай частцы краіны кароткачасовымі дажджамі. Месцамі дажджы будуць суправаджацца навальніцамі і ўзмацненнем ветру да моцнага парывістага. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 15—20 градусаў. У дзённыя гадзіны тэмпературны фон будзе даволі кантрасны: ад плюс 22 градусаў па паўночным захадзе ў зоне атмасфернага фронту да плюс 32 градусаў па паўднёвым усходзе краіны.

Цяпло пачне сыходзіць ад нас ужо ў нядзелю. У гэты дзень яшчэ будзе захоўвацца ўплыў франтальнага падзелу, які ссоўваецца ў паўднёва-ўсходнім напрамку. Таму ноччу і раніцай на большай частцы тэрыторыі краіны, а днём на паўднёвым усходзе прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Пры гэтым тэмпературны фон па краіне панізіцца: ноччу будзе плюс 9—15 градусаў, а ў паўднёва-ўсходніх раёнах плюс 16—19 градусаў. Максімальная тэмпература ўдзень не перавысіць плюс 20—26 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў сіноптыкаў, у пачатку чарговага працоўнага тыдня атмасферны ціск пачне расці, дажджоў стане менш.

# ІНТЭРАКТЫЎНЫЯ ЗАНЯТКІ, ВУЧЭБНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ І ЭКСКУРСІІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Таксама да Года гістарычнай памяці Інстытут гісторыі разам з Саюзам пісьменнікаў Беларусі і дзяржаўнымі выдавецтвамі распачаў работу па падрыхтоўцы навукова-папулярных выданняў, звязаных з гісторыяй беларускай дзяржаўнасці, важнымі падзеямі ў гісторыі нашай краіны і знакамітымі асобамі. Аб гэтым паведаміў **дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Вадзім ЛАКІЗА.**

— Напрыканцы жніўня ў выдавецтве «Беларуская навука» выйдзе кніга, прысвечаная Рыжскаму мірнаму дагавору. Да 17 верасня, Дня народнага адзінства, у Нацыянальнай акадэміі навук і, магчыма, на іншых пляцоўках адбудзецца прэзентацыя гэтага выдання. У кнізе адлюстраваны ўплыў дагавора, які, заўважу, вырашаў лёс беларусаў, але прымаўся без іх удзелу, на наступныя геапалітычныя працэсы. Беларускія, украінскія і расійскія навукоўцы будуць прадстаўлены на старонках выдання. Таксама мы рыхтуем работы, звязаныя з гісторыка-культурнай спадчынай у рэгіёнах. Вядзецца сістэматызацыя і апрацоўка новых дакументаў да дня НАН Беларусі — мы выпусцім адноўлены зборнік дакументаў, прысвечаны першым гадам функцыянавання Акадэміі. Вядзецца пастаянная работа, звязаная з вывучэннем падзей Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку генацыду беларускага народа.

Вадзім Лакіза звярнуў увагу і на іншыя выданні супрацоўнікаў Інстытута гісторыі, якія ўжо паспелі пабачыць свет. Сярод іх — зборнік навуковых артыкулаў «Вялікае Княства Літоўскае: заканадаўчае забеспячэнне дзяржаўнага суверэнітэту», выданне, прысвечанае Інстытуту беларускай культуры ў перыяд з 1922 да 1928 года, а таксама аўтарская манаграфія маладога даследчыка Аляксея Капліева «Станаўленне савецкай аховы здароўя на тэрыторыі Беларусі ў 1917—1921 гадах».

Адным з напрамкаў работы навукоўцаў-гісторыкаў з'яўляецца супрацоўніцтва з моладдзю. Аб гэтым распавяла **старшыня савета маладых навукоўцаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі Таццяна ДАЛГАЧ.** Адзін з рэалізаваных праектаў меў інтэрактыўны характар: падчас наведвання інстытута навучэнцы мінскіх школ шукалі кіналяпы ў гістарычных фільмах, па захаваных костках вызначалі, ад якой хваробы памёр чалавек, а таксама ляпілі гаршкі па неалітычнай тэхналогіі:

— Савет маладых вучоных рэалізоўвае шэраг ініцыятыў, накіраваных на сувязь са студэнцкай і школьнай моладдзю. Адукацыйны і прафарыентацыйны праект «Акадэмія маладых гісторыкаў» закрануў школы Першамайскага раёна горада Мінска. Удзел у праекце прынялі 30 школьнікаў, якія на базе Інстытута праслухалі курс адаптаваных акадэмічных лекцый, прынялі ўдзел у майстар-класах і экскурсіях. Гэта дазволіла ім атрымаць уяўленне, чым займаецца Інстытут гісторыі.

Таццяна Далгач засяродзіла ўвагу на факце, што 100 гадоў таму адбылося станаўленне акадэмічнай навукі ў Беларусі. Людзі, якія стварылі Інстытут беларускай культуры, лічыліся сапраўднымі кумірамі, накшталт рок-зорак сваёй эпохі. Гэта былі вядомыя літаратары, настаўнікі і інтэлігенты:

— Важна, каб беларусы не толькі памяталі імёны гэтых людзей, але і ведалі, як фарміравалася беларуская навука. Тым больш што ў Мінску засталося шмат месцаў, звязаных з Інбелкультам. Мы палічылі, што можна зрабіць экскурсію па гэтых будынках, — і ў нас атрымалася. Экскурсія ўжо апрабаваная і перыядычна праводзіцца, так што запрашаем усіх ахвотных далучыцца, — дадала старшыня савета маладых навукоўцаў Інстытута гісторыі.

Важным аспектам дзейнасці інстытута з'яўляецца падрыхтоўка вучэбных дапаможнікаў для навучэнцаў — аб гэтым паведаміла **старшы навуковы супрацоўнік цэнтра гісторыі навукі і архіўнай справы Інстытута гісторыі НАН Беларусі Марына КРАСНОВА.** Дапаможнікі выкарыстоўваюцца пры правядзенні факультатыўных заняткаў у школах і ВНУ:

— Яшчэ на пачатку 2000-х мы заўважылі тэндэнцыю: заходнія краіны імкнуцца перапісаць і фальсіфікаваць вынікі Другой сусветнай вайны. Для Беларусі вельмі важна захаваць праўду, а таксама той унёсак, што быў зроблены СССР і нашай рэспублікай. Трэба адзначыць, што на працягу дваццаці гадоў было праведзена шмат навуковых даследаванняў — школа ваенных гісторыкаў Беларусі, бадай, самая моцная на тэрыторыі ўсёй постсавецкай прасторы.

Напрыканцы прэс-канферэнцыі спікеры нагадалі аб правядзенні Нацыянальнай акадэміяй навук рэспубліканскага конкурсу творчых работ, прысвечаных Году гістарычнай памяці. Удзельнікам прапануюць паспрабаваць свае сілы ў наступных намінацыях: «Найбольш значныя падзеі ў гісторыі беларускай дзяржаўнасці», «Знакамітыя асобы беларускай зямлі», а таксама «Вялікая Айчынная вайна ў памяці маёй сям'і». Работы будуць прымацца да верасня, а дадатковую інфармацыю і палажэнне аб конкурсе можна знайсці на сайтах НАН Беларусі і Інстытута гісторыі. З 1 лістапада пачнецца работа членаў журы, у снежні адбудзецца вялікая сустрэча з удзельнікамі конкурсу, падчас якой уручаць дыпломы і абяруць лаўрэатаў.

**Арына КАРПОВІЧ.**

Грошы і прыбытак

# Бум на дэпазіты

## Мы не купляем тавары, а «робім» грошы?

**У чэрвені насельніцтва літаральна рынулася ў айчынныя банкі, каб пакласці туды свае грошы на дэпазіты, і ў выніку іх рублёвыя сродкі на ўкладах выраслі на 599,2 мільёна рублёў, а валютныя — на 122,1 мільёна долараў, паведамляе сайт банкаў Беларусі.**

Пры гэтым істотна павялічыліся як тэрміновыя ўклады, так і перакладныя, гэта значыць, сродкі на банкаўскіх картках. У прыватнасці, пераводныя дэпазіты насельніцтва ў беларускіх рублях у чэрвені павялічыліся ў параўнанні з маем на 465,7 мільёна рублёў — да 3 571,3 мільёна рублёў.

У той жа час тэрміновыя рублёвыя дэпазіты насельніцтва выраслі на 133,5 мільёна рублёў і дасягнулі 5728 мільёнаў рублёў. З пачатку года апошнія дэпазіты падняліся на 629,2 мільёна рублёў, хоць у значнай ступені — за кошт працэнтаў.

Хутчэй за ўсё, жыхары нашай краіны імкнуцца выратаваць зберажэнні ад інфляцыі, карыстаючыся параўнальна высокімі стаўкамі па дэпазітах. Тавараў усе ўжо накупляліся, да таго ж цяпер на піку цэн можна не спяшацца з новымі пакупкамі. Падобнымі меркаваннямі фізічныя асобы кіраваліся, відаць, і пры нарошчванні велічыні сваіх дэпазітаў у замежнай валюце. Тэрміновыя валютныя ўклады насельніцтва ў чэрвені павялічыліся на 91,3 мільёна долараў — да 3 738,6 мільёна долараў, а пераводныя дэпазіты прыраслі на 30,8 мільёна долараў, дасягнуўшы 851,9 мільёна долараў.

У суме ўсе валютныя дэпазіты фізічных асоб у чэрвені павялічыліся на 122,1 мільёна долараў — да 4 590,5 мільёна долараў. Але за паўгоддзе ўклады скараціліся на 597,1 мільёнаў долараў, гэта значыць, пакуль наступствы масавага зняцця сродкаў насельніцтва з валютных дэпазітаў у сакавіку не кампенсаваныя.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# У НАШАЙ КРАІНЕ СІСТЭМНАЙ КАРУПЦЫІ НЯМА. І НЕ БУДЗЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Разам з тым спецыяліст адзначыў, што ў нашай краіне няма сістэмных, тым больш звязаных з арганізаванай злачыннасцю, карупцыйных праяў. Існуючы ў краіне комплекс заканадаўчых, арганізацыйных і іншых механізмаў процідзеяння карупцыі дазволіў мінімізаваць карупцыйную злачыннасць, якая не ўплывае на развіццё эканамічных і сацыяльных працэсаў. Менавіта з гэтай прычыны сярод іншых дзяржаў СНД Беларусь характарызуецца як дзяржава, найменш схільная да карупцыі.

Больш карупцыйных злачынстваў здзейснена ў сферах прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю, дзяржаўнага кіравання, будаўніцтва, транспарту, аховы здароўя і адукацыі.

Ёсць факты набыцця таварнаматэрыяльных каштоўнасцяў па завышаным кошце, лабіравання інтарэсаў канкрэтных пастаўшчыкоў, атрымання хабараў за вырашэнне пытанняў па заключэнні і выкананні гаспадарчых дагавораў, дагавораў арэнды вытворчых і іншых памяшканняў, крадзяжу грашовых сродкаў і маёмасці.

Ігар Грэйба падкрэсліў, што да крымінальнай адказнасці прыцягваюцца як шараговыя супрацоўнікі дзяржаўных органаў і арганізацый, так і службовыя асобы, якія займаюць адказнае становішча.

Па словах начальніка ўпраўлення, прыкладна палова праверак выканання антыкарупцыйнага заканадаўства — найбольш складаныя, яны датычацца значных сфер эканамічнай дзейнасці. У ходзе іх правядзення ўстанаўліваюцца розныя парушэнні ў сферы закупак, ёсць факты неабгрунтаванага абмежавання доступу да ўдзелу ў працэдурах закупак, парушэнні парадку іх правядзення, маніпулявання конкурснымі дакументамі, дачы неаб'ектыўнай ацэнкі прапаноў удзельнікаў закупак. Мерамі пракурорскага рэагавання на пачатковай стадыі працэдуры закупкі толькі ў 2021 годзе папярэджана выкарыстанне з парушэннем заканадаўства сродкаў на суму звыш 8,3 мільёна рублёў.

## На аператыўным уліку знаходзіцца каля 500 чалавек са «злачыннага свету»

На ўліку МУС Беларусі цяпер знаходзіцца шэсць «злодзеяў у законе», паведаміў **начальнік Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй Міністэрства ўнутраных спраў Васіль СЫСОЕЎ.**



«Трое з іх адбываюць пакаранне. Адзін знаходзіцца ў вышуку. Адзін вызваліўся, але знаходзіцца пад нашай пільнай увагай і кантролем», — распавёў Васіль Сысоеў. Яшчэ адзін, Аляксандр Кушняроў, быў нядаўна затрыманы (па падазрэнні ў спробе арганізацыі двайнога забойства). Паводле інфармацыі прадстаўніка МУС, на аператыўным уліку цяпер таксама налічваецца каля 500 чалавек, «якія займаюць рознае становішча ў іерархіі злачыннага свету». Але гэтая лічба нестатычная і пастаянна абнаўляецца.

«Толькі падраздзяленнямі ГУБАЗіК у гэтым годзе з незаконнага абароту канфіскавана 101 адзінка агнястрэльнай зброі, больш за 12 з паловай тысяч патронаў, тры самаробныя выбухныя прылады. З рэзанансных прыкладаў хацелася б успомніць канфіскацыю супрацоўнікамі ГУБАЗіК у жніўні 2021 года аўтамата Калашнікава, украдзенага ў 1993 годзе падчас разбойнага нападу на вайскоўца, які нёс вартавую службу», — адзначыў Васіль Сысоеў, звяртаючы ўвагу, што сучасныя метады расследавання дазваляюць раскрываць справы нават такога вялікага тэрміну даўнасці.

## Замежным крымінальным аўтарытэтам у нас «нясоладка»

«У дачыненні да замежных лідараў злачыннага асяроддзя, якія імкнуцца прабрацца да нас у краіну, Галоўнае ўпраўленне па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС выбудавала эфектыўны алгарытм дзеянняў. Гэта аператыўная адпрацоўка, дэпартацыя і забарона на ўезд у краіну на тэрмін да 10 гадоў. Дзякуючы такой рабоце ўдалося істотна знізіць колькасць крымінальных лідараў, якія спрабуюць перасекчы беларускую граніцу», — сказаў Васіль Сысоеў.

Ён дадаў, што за апошнія два гады пры перасячэнні граніцы затрыманы толькі адзін расійскі злодзей у законе. «У сакавіку гэтага года паблізу дзяржаўнай граніцы Беларусі з Літвой пагранічнікі затрымалі расійскага злодзея ў законе, які планаваў у патоку бежанцаў з арабскіх краін трапіць на тэрыторыю Літвы. Пры гэтым у Беларусі ён знаходзіўся нелегальна, будучы пад прэвентыўным наглядам паліцыі Расіі. Ён быў затрыманы, прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці, падвергнуты прымусовай высылцы, яму таксама ўстаноўлена забарона ўезду ў нашу краіну тэрмінам на пяць гадоў», — праінфармаваў начальнік Галоўнага ўпраўлення.

У Дзяржаўны пагранічны камітэт накіравана больш за 600 дарučэнняў аб кантролі перасячэння дзяржграніцы ў дачыненні да замежных злодзеяў у законе і крымінальных аўтарытэтаў. Гэтая работа непарыўна звязаная з процідзеяннем незаконнаму абароту зброі і боепрыпасаў, а адпаведна, патэнцыяльным каналам паступлення зброі ў арганізаваны злачынны свет.

## Доказаў па гучных справах цалкам дастаткова

Следчы камітэт расследуе крымінальную справу ў дачыненні да службовых асоб ААТ «Газпрам трансгаз Беларусь», паведаміў **начальнік Галоўнага ўпраўлення па расследаванні злачынстваў у сферы арганізаванай злачыннасці і карупцыі Следчага камітэта Уладзімір ШЫШКО.**

«Цэлы шэраг высокапастаўленых службовых асоб гэтага акцыянернага таварыства паліўнай накіраванасці займаўся атрыманнем незаконнага ўзнагароджання ад камерцыйных структур за пастаўку абсталявання, у некаторых выпадках, наадварот, — за яго непастаўку. Узнагароджанне ў гэтых выпадках вылічалася сотнямі тысяч рублёў, гэта значыць даволі істотнай сумай хабару. Цяпер вырашаецца пытанне аб кампенсацыі гэтых грошай», — сказаў Уладзімір Шышко.

Паводле яго слоў, большасць фігурантаў крымінальнай справы дае прызнальныя паказанні і актыўна супрацоўнічае са следствам. Арганізацыя «Газпрам трансгаз Беларусь» таксама актыўна ўзаемадзейнічае з органамі. Топ-менеджары ўсвядомілі, што ёсць слабыя месцы ў іх эканамічнай дзейнасці, і проста цяпер, не чакаючы заканчэння расследавання, робяць захады па ліквідацыі шчылін, якія меліся ў іх дзейнасці.

Аналагічныя абвінавачанні прад'яўлены службовым асобам дзяржаўнага аб'яднання «Беларуская чыгунка». Крымінальная справа знаходзіцца на стадыі заканчэння, у найбліжэйшы час яна будзе накіравана ў суд.

«За апошні час узровень аператыўнага суправаджэння і дзеянняў аператыўных падраздзяленняў сістэмы МУС і КДБ значна вырасла. Адбываецца даволі дэталёвая фіксацыя злачыннай дзейнасці. Калі раней мы сутыкаліся з сітуацыямі, калі разумелі, што тут здзейснена злачынства, але мелася вялікая складанасць са зборам доказаў, то цяпер узровень аператыўнага суправаджэння і выяўлення гэтых злачынстваў высокі, таму што адбываецца і аўдыё-, і відэафіксацыя, і дакументальнае суправаджэнне ўсіх гэтых мерапрыемстваў», — сказаў на заканчэнне Уладзімір Шышко.

## За здзек і самадурства ў інтэрнэце можна нават «сесці»

Камітэтам па злачынствах выдзелены асобныя напрамкі, якія накіраваны на разладжванне і падрыў дзяржаўнага ладу. Напрыклад, сем чалавек абвінавачваюцца ў спробах зрыву рэспубліканскага рэферэндуму па пытанні ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Цяпер завершана расследаванне, і ў судзе ўжо знаходзіцца шэраг крымінальных спраў па гэтых фактах.

Як растлумачыў Уладзімір Шышко, гаворка ідзе аб дзейнасці асобнай групы грамадзян, звязанай з рассылкай у вялікай колькасці лістоў членам выбарчых камісій, простым грамадзянам, каб яны насуперак сваёй волі і закону рабілі злачынныя дзеянні, накіраваныя на зрыў рэферэндуму. «Намі ў цесным узаемадзеянні з аператыўнымі супрацоўнікамі, у тым ліку сістэм МУС, КДБ, шэраг такіх грамадзян быў устаноўлены. Цяпер сямі з іх выстаўлена абвінавачанне, крымінальныя справы таксама накіраваныя ў суд».

Па яго словах, вытворцамі і адпраўшчыкамі гэтых лістоў значыліся вядомыя ў грамадстве людзі і арганізацыі. «Гэта былі Генеральная пракуратура, Следчы камітэт, КДБ, альбо ад імя нейкіх вядомых асоб, што надавала значнасць такім лістам, што было спробай паўплываць на галовы грамадзян», — канстатаваў начальнік галоўнага ўпраўлення.

Уладзімір Шышко згадаў некалькі крымінальных спраў гэтай катэгорыі. «Не магу не назваць іх — гэта цэлы шэраг крымінальных спраў, звязаных з гібеллю супрацоўніка КДБ пры затрыманні аднаго з экстрэмістаў. Пасля яго смерці, зноў жа па ініцыятыве пэўных дэструктыўных экстрэмісцкіх аб'яднанняў, асобныя грамадзяне пачалі выкладваць у сетцы негатыўныя каментарыі, у тым ліку ў адрас загінулага супрацоўніка, праваахоўнай сістэмы, дзяржаўных устаноў і арганізацый. Абсалютна ўсе грамадзяне, якія пакідалі гэтыя каментарыі, былі выяўлены, частка крымінальных спраў яшчэ знаходзіцца ў вытворчасці. У цяперашні час у дачыненні да 57 каментатараў крымінальныя справы накіраваны ў суд. У чарговы раз хацелася б звярнуць увагу людзей на тое, што тэхнічныя магчымасці ў органаў правапарадку значна выраслі, любыя дзеянні ў сетцы не застаюцца абязлічанымі, заўсёды можна знайсці, хто і што канкрэтна рабіў у інтэрнэце, і даць гэтаму прававую ацэнку. Таму будзьце ўважлівыя, не паддавайцеся на правакацыі, адказвайце за свае дзеянні», — сказаў ён на заканчэнне.

**Міхась ПАДДУБНЫ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Камбаджыец Каа Кім Хорн зойме пасаду генеральнага сакратара АСЕАН



Міністр у канцылярыі прэм'ер-міністра Камбоджы Каа Кім Хорн зойме пасаду генеральнага сакратара Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН), пачынаючы з 2023 года. Пра гэта паведаміў дзяржаўны сакратар Міністэрства замежных спраў і міжнароднага супрацоўніцтва Камбоджы Кунг Фаак, перадала ТАСС. Паводле яго слоў, прызначэнне ўжо было ўзгоднена міністрамі замежных спраў краін асацыяцыі падчас 55-й сустрэчы кіраўнікоў знешнепалітычных ведамстваў рэгіянальнага блока, якая адкрылася ў Пнампені. Каа Кім Хорн стане першым у гісторыі грамадзянінам Камбоджы, які атрымаў пасаду генеральнага сакратара АСЕАН. На гэтай пасадзе ён зменіць прадстаўніка Брунея Лім Джок Хоя, які ўступіў на пасаду 1 студзеня 2018 года. Як вядома, асацыяцыя дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі была заснавана ў 1967-м і сёння аб'ядноўвае дзесяць краін Паўднёва-Усходняй Азіі — Бруней, В'етнам, Інданезію, Камбоджу, Лаос, Малайзію, М'янму, Сінгапур, Тайланд і Філіпіны.

## Абарот валютнага рынку Кітая перавысіў 20 трыльёнаў юаняў

Аб'ём аперацый на валютным рынку КНР у чэрвені склаў 20,3 трыльёна юаняў ($3,03 трлн), сведчаць даныя Дзяржаўнага ўпраўлення валютнага кантролю краіны (SAFE). У тым ліку 3,3 трлн юаняў прыйшлося на транзакцыі ў замежнай валюце паміж банкамі і іх кліентамі, астатнія 16,98 трлн — на міжбанкаўскія валютныя аперацыі. У першым паўгоддзі сукупны абарот валютнага рынку КНР склаў 111 трлн юаняў ($17,16 трлн), прыводзіць даныя ведамства агенцтва «Сіньхуа». Чыстая купля замежнай валюты камерцыйнымі банкамі Кітая ў студзені—чэрвені склала 545,2 млрд юаняў ($85,2 млрд), паведаміла SAFE. Фінарганізацыі набылі за гэты перыяд валюту на суму 8,6 трлн юаняў, у той час як продажы былі роўныя 8,1 трлн юаняў.

## Улады Нідэрландаў аб'явілі аб недахопе вады ў краіне

У краіне адзначаецца дэфіцыт вады, могуць спатрэбіцца сур'ёзныя захады для вырашэння праблемы. Аб гэтым паведаміла выданне Dutch News са спасылкай на міністра па справах інфраструктуры краіны Марка Харберса. На яго думку, сітуацыя настолькі сур'ёзная, што рашэнні трэба будзе прымаць на нацыянальным узроўні, а не з мясцовымі ўладамі. У сувязі з рызыкай пагаршэння становішча Харберс заклікаў жыхароў эканоміць прэсную ваду. Выданне адзначае, што некаторыя мясцовыя органы ўлады, якія адказваюць за водныя рэсурсы, ужо зрабілі крокі па рашэнні праблемы, у прыватнасці ўвялі забароны для фермераў на паліў палеткаў. Акрамя таго, урад Нідэрландаў стварыў спецыяльную групу па вызначэнні неабходных дзеянняў для барацьбы з дэфіцытам вады.

З нагоды

# Маеш талент — ідзі на «Фактар.by»

Белтэлерадыёкампанія анансавала даты правядзення кастынгу на другі сезон шоу «Фактар.by». Вочныя сустрэчы канкурсантаў з сябрамі журы адбудуцца з 14 да 21 жніўня ў канцэртнай зале «Мінск». Узяць удзел у праслухванні могуць як сольныя выканаўцы, так і вакальныя калектывы. Жадаючым трапіць на праект трэба будзе падрыхтаваць 2-3 разнапланавыя кампазіцыі ў акапэльным выкананні. Тым, хто валодае музычным інструментам, арганізатары раяць узяць яго з сабой на кастынг — журы могуць прапанаваць прэтэндэнту дапоўніць сваё выступленне музычным суправаджэннем. Трэба звярнуць увагу і на тое, што мінімальны ўзрост удзельнікаў — 16 гадоў.

Прэм'ера першага сезона праекта адбылася 9 кастрычніка мінулага года. Для здымак шоу на пляцоўцы «Беларусьфільма» была ўсталявана неабходная інфраструктура з відовішчнымі дэкарацыямі. Галоўная сцэна размясцілася на самым вялікім павільёне ў Беларусі, плошча якога 1200 квадратных метраў, акрамя таго, арганізатарамі было задзейнічана 24 камеры. «Фактар.by» вылучаецца дзякуючы некаторым асаблівасцям. У першую чаргу гэта публічныя праслухванні, падчас якіх настаўнікі — вядомыя спевакі, а таксама зоркі шоу-бізнесу — абіраюць найлепшых выканаўцаў. Вядома, падчас выступлення канкурсантаў выкарыстанне фанаграм забаронена. З адметнасцяў можна вылучыць і актыўную работу ў сацыяльных сетках: «Фактар.by» выпускае дзённікі праекта, у якіх расказваецца аб самых яскравых момантах праграмы. Рэгулярна абнаўляецца старонка ў Instagram, дадаюцца навіны і ў тэлеграм-каналах — у іх з'яўляюцца галоўныя анонсы праекта. Афіцыйная старонка другога сезона «Фактар.by» ўжо з'явілася ў Instagram.




Калі вы вырашылі паспрабаваць свае сілы ў кастынгу, не забудзьцеся запоўніць электронную форму на сайце www.tvr.by з указаннем дня праслухвання. Для атрымання дадатковай інфармацыі звяртайцеся, калі ласка, у тэлеграм-канал ATN_NEWS, на сайт Белтэлерадыёкампаніі, а таксама сачыце за навінамі ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1».

**Арына КАРПОВІЧ.**

## ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 171

**З 22 да 24 ліпеня на базе РТБ «Талька» (Пухавіцкі раён) адбыўся XXIV адкрыты раённы турнір па шашках-64 «Мар'іна Горка — 2022». У турніры ўзялі ўдзел 32 шашысты з Беларусі, Грузіі і Расіі, сярод якіх два міжнародныя гросмайстра і шэсць майстроў. Перамог беларускі майстар Віталь Новікаў.**



**№ 106**

**Белыя простыя:** g1, e3, g3, c5 (4)

**Чорныя дамкі:** e5, g5, c7, b8 (4)

На дыяграме пазіцыя складзеная вядучым аддзела па правілах бразільскіх шашак. Белыя пачынаюць і перамагаюць з дапамогай адметных правілаў.

Камбінацыйныя фрагменты са сваей практычнай гульні даслаў Юрый Голікаў (Расія)

**№ 107**

**Белыя простыя:** e1, d2, f2, a3, c3, e3, h4, g5, h6 (9)

**Чорныя простыя:** g3, f4, e5, b6, a7, g7, b8, f8, h8 (9)

**№ 108**

Голікаў Ю. — Алексееў В.

**Белыя простыя:** a1, c1, g1, b2, f2, h2, a3, c3, g3, f4, h4 (11)

**Чорныя простыя:** a5, c5, e5, b6, d6, h6, e7, g7, d8, f8, h8 (11)

**№ 109**

**Белыя простыя:** b2, d2, e3, b4, h4, c5 (6)

**Чорныя простыя:** d4, g5, d6, f6, h6, e7, b8 (7)

Мініяцюры ў шашкі-00 склаў Вадзім Булат (Мінск).

**№ 110**

**Белыя простыя:** 47, 41, 44, 40, 33, 29, 30 (7)

**Чорныя простыя:** 42, 38, 31, 25, 18, 14, 8 (7)

**№ 111**

**Белыя простыя:** 41, 45, 32, 23, 24, 20, 14 (7)

**Чорныя простыя:** 40, 34, 35, 28, 21, 15, 7 (7)

**№ 112**

**Белыя простыя:** 44, 38, 19, 20, 7, 8, 10 (7)

**Чорныя простыя:** 41, 40, 31, 35, 28, 29, 30 (7)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні:**

Выпуск № 170 ад 22.07.22.

№ 98 1. d6-c7

[ 1. h6-g7? d8:h8 2. d6-c7 f8-d6 3. c7:e5 h8:d4 4. a5-b6 d4:a7 ]

[ 1. a5-b6? d8:g5 2. h6:f4 f8:a7 3. f4-e5 a7-c5 4. e5-f6 c5-f8 ]

1...f8:b8

[ 1...d8:b6 2. a5:c7 f8:b8 3. h6-g7 b8-e5 4. g7-f8 ( 4. g7-h8? e5-a1 ) ]

2. a5-b6 d8:a5 3. h6-g7=

№ 99 c5, d6, c1, f4, g:e3, f6(g3), e3(h2), g1, +.

№ 100 1. e7-d8 a5:g7 2. d8-e7 f8:d6 3. h6:c1 f4:h6 4. h2:f4 e3:g5 5. g1:e3 d2:f4 6. h4:f6 f4-g3 7. c1-e3 g3-h2 8. e3-g1+

№ 101 17-12, 19-13, 4(27 A), 15, 46+ A(13), 1, 23+

№ 102 8, 4, 17, 8, 1(32 A), 29(37), 47+ A(33), 34(38), 48+

№ 103 20, 14, 5, 34(18), 3, 17(45), 50+

№ 104 1. f2-g3 f6:d4 2. c1:g5 h6:f4 3. e7-d8 c5:e7 4. d8:a7 a3:c5 5.a7:a1 +

